# ШЛЯХ ДА ВОЛІ

НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧЫ РУХ

нацыянальна-вызваленчы рух

# ШЛЯХ да ВОЛІ

Нацыянальна-вызваленчы рух
“Шлях да волі”
- гэта добраахвотнае грамадскае аб’яднанне беларусаў РБ і за мяжой, якое ставіць за мэту ліквідацыю незаконнага і злачыннага рэжыму Лукашэнкі А.Р. і ўстанаўленне ў Рэспубліцы Беларусь абранага законным шляхам дэмакратычнага ўраду

**Падтрымлівае любыя дзеянні, накіраваныя на вызваленне палітвязняў і падтрымку грамадзянаў РБ і замежных грамадзянаў, якія пераследуюцца злачынным рэжымам Лукашэнкі А.Р. па палітычных матывах.**

**Лічыць тэрыторыю Беларусі акупаванай войскамі Расійскай Федэрацыі пры садзейнічанні злачыннага рэжыму Лукашэнкі А.Р.**

**Лічыць Лукашэнку А.Р. персонай, якая незаконна прысвоіла паўнамоцтвы прэзідэнта, а са снежня 2021 г. – таксама і прадстаўніком расійскай акупацыйнай адміністрацыі, дзяржаўным здраднікам і ваенным злачынцам.**

Лічыць адміністрацыйныя і іншыя органы і арганізацыі, створаныя карупцыйным псеўдаўрадам Лукашэнкі А.Р. няздольнымі легітымна ажыццяўляць свае функцыі, а таксама і прадстаўляць РБ у міжнародных арганізацыях.

Лічыць усе заканадаўчыя акты, прынятыя адміністрацыяй Лукашэнкі А.Р. супярэчнымі Канстытуцыі РБ, прынятай 15 сакавіка 1994 г., якія не маюць законнай сілы з прычыны страты легітымнасці органамі, якія прынялі іх, а таксама вынікі прэзідэнцкіх, парламенцкіх і іншых выбараў, якія ажыццяўляліся на працягу існавання незаконнага ўрада Лукашэнкі А.Р.

Выступае за стварэнне ў РБ законнага дэмакратычнага ўрада пры падтрымцы і пад наглядам адпаведных міжнародных арганізацый пасля правядзення дэакупацыі.

**Выступае за захаванне беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці, мовы і культуры, але паважае і прызнае такое ж права прадстаўнікоў іншых народаў, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі.**

**Выступае за афіцыйнае прыняцце беларускай мовы як адзінай дзяржаўнай у Рэспубліцы Беларусь.**

**Лічыць Рэспубліку Беларусь, таксама як і сучасныя дзяржавы, чые тэрыторыі гістарычна ўваходзілі ў склад ВКЛ (Польская Рэспубліка, Літоўская Рэспубліка, Украіна), пераемнікамі традыцый і культуры Вялікага Княства Літоўскага, якія маюць роўныя правы на культурную і гістарычную спадчыну ВКЛ у межах міжнародна прынятых нормаў.**

**Дамагаецца поўнай і як мага больш хуткай дэакупацыі суверэннай дзяржавы Беларусь у рамках міжнародна прызнаных межаў усімі магчымымі шляхамі.**

**Патрабуе вызвалення ўсіх асуджаных па палітычных матывах грамадзян РБ і грамадзян іншых дзяржаў на тэрыторыі РБ і за яе межамі, а таксама неадкладнага спынення юрыдычнага і любога іншага пераследу грамадзян РБ і грамадзян іншых дзяржаў незаконным рэжымам Лукашэнкі А.Р. на тэрыторыі РБ і за яе межамі.**

**Патрабуе справядлівага пакарання для ўсіх без выключэння саўдзельнікаў дыктатарскага рэжыму Лукашэнкі А.Р. незалежна ад тэрміну даўнасці і ступені ўдзелу ў насаджэнні дыктатуры, пераследзе, катаваннях, забойствах і іншых злачынствах перад народам Беларусі.**

Патрабуе справядлівага пакарання для міжнародных ваенных злачынцаў як з ліку калабарацыяністаў, так і прадстаўнікоў расійскай акупацыйнай адміністрацыі.

Рашуча асуджае ўварванне Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі на тэрыторыю незалежнай і суверэннай дзяржавы Украіна.

Прызнае маральную і палітычную адказнасць беларускага народа за дзеянні, здзейсненыя дыктатарскім рэжымам А.Р. Лукашэнка ў адносінах да незалежнай і суверэннай дзяржавы Украіна.

Рашуча асуджае агрэсіўную знешнюю палітыку РФ, а таксама палітыку схаванага этнацыду РФ у дачыненні да паняволеных ёю народаў, як унутры РФ, так і за яе межамі.

Падтрымлівае дэкларацыю аб дэкаланізацыі Расіі, прынятую ў Празе 23 ліпеня 2022 года на Форуме свабодных народаў Расіі.

Выказвае падтрымку ўсім паняволеным народам Расійскай Федэрацыі ў барацьбе за незалежнасць і стварэнне на землях гэтых народаў незалежных дзяржаў.

Мы адкрытыя для супрацоўніцтва з любымі арганізацыямі, якія маюць сваімі мэтамі павяртанне законнага дэмакратычнага канстытуцыйнага ладу РБ замест існуючага ўзурпатарскага і калабарацыянісцкага рэжыму Лукашэнкі А.Р.

Мы хочам бачыць незалежную і суверэнную Беларусь паўнапраўным членам міжнароднай супольнасці, які паважае і выконвае правілы і нормы міжнароднага права і праводзіць палітыку міру і згоды паміж дзяржавамі.

# Хай жыве вольная Беларусь!

